ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1981
12
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 6 (1306)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.




## ПЕРШАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

**па падвядзенню вынікаў педагагічнай практыкі студэнтаў-завочнікаў аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры адбылася на філалагічным факультэце. Ініцыятары яе правядзення — выкладчыкі кафедры беларускай літаратуры, кіраўнікі практыкантаў В. В. Каладзінскі і А. І. Цудня. З уступным і заключным словам выступіў дэкан філфака дацэнт А. А. Волк. Ён падкрэсліў важнасць і неабходнасць правядзення падобных канферэнцый са студэнтамі вячэрняй і завочнай формы навучання. У сваіх выступленнях (а іх было 13) студэнты выказалі шмат цікавых думак, меркаванняў, падзяліліся асабістымі назіраннямі аб выкладанні мовы і літаратуры ў гарадскіх і сельскіх дзённых і вячэрніх школах, ГПТВ, унеслі шэраг значных прапаноў па ўдасканаленню вывучэння асобных філалагічных дысцыплін на завочным факультэце.**

**Л. ІВАНОВА,**
**студэнтка VI курса аддзялення беларускай і рускай мовы завочнага факультэта.**

## ДЗІЦЯЧЫ ТАНЦАВАЛЬНЫ

**ансамбль, у састаў якога ўвайшлі амаль 40 дзяцей супрацоўнікаў універсітэта, рэгулярна, адзін раз у тыдзень, праводзіць заняткі ў актавай зале БДУ. Азам танцавальнага майстэрства вучыць сваіх падапечных заслужаны дзеяч культуры БССР М. В. Лапша, мастацкі кіраўнік народнага ансамбля народнага танца «Крыжачок». Юныя танцоры, якім зараз усяго толькі 6—11 год, выступяць упершыню на ўрачыстым канцэрце, прысвечаным 60-годдзю БДУ.**

**Г. МАРЦІНКЕВІЧ,**
**старшыня культурна-масавай камісіі мясцкома БДУ.**

## 60-ГОДДЗЮ БДУ

**прысвечаны творчы конкурс на лепшы твор паэтычнага, музычнага, драматычнага жанраў, а таксама на лепшае сцэнарнае рашэнне святочнага канцэрта, прысвечанага юбілею. Конкурс праводзяць камітэт камсамола, прафком і праўленне студэнцкага клуба.**

**У конкурсе могуць прымаць удзел выпускнікі, студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта. Тэрмін прыёму на конкурс творчых работ — 15 красавіка 1981 года.**

**Лепшыя творчыя работы будуць адзначаны Ганаровымі граматамі, каштоўнымі падарункамі.**

**А. ЦВЯХ.**

**АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЕКТ ЦК КПСС ДА XXVI З'ЕЗДА ПАРТЫІ «АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ЭКАНАМІЧНАГА І САЦЫЯЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ СССР НА 1981—1985 ГАДЫ І НА ПЕРЫЯД ДА 1990 ГОДА».**

## Увагу хвалюючым праблемам

НА ФІЗІЧНЫМ факультэце адбыліся сходы па абмеркаванню праекта ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі, на якіх выступіла 176 супрацоўнікаў і студэнтаў фізфака і пададзена 49 прапаноў і крытычных заўваг, прадэманстравана глыбокая зацікаўленасць кожнага ў справах краіны, народа, свайго працоўнага калектыву.

Супрацоўнікі кафедры біяфізікі, якія займаюцца зараз пытаннямі захавання садавіны і гародніны, прааналізавалі тыя палажэнні праекта, што датычаць праблемы захавання харчовай сыравіны, і заўважылі, што пытанні комплекснага навуковага падыходу да гэтай праблемы не знайшлі адлюстравання ў ім. Яны прапанавалі дапоўніць раздзел III «Асноўных напрамкаў» так: **«У галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук сканцэнтраваць намаганні на вырашэнні наступных важнейшых праблем:**

**— распрацоўцы навуковых асноў адзінага цыкла вырошчвання, нарыхтоўкі, захавання і перапрацоўкі харчовай сыравіны;**

**— удасканаленні метадаў перавозкі, захавання, упакоўкі і кантролю за якасцю прадуктаў харчавання, якія дазволяць захаваць іх харчовую каштоўнасць і знізіць страты.**

Па пытаннях народнай адукацыі дацэнт Г. В. Шышкін, старшыя выкладчыкі Г. І. Пятровіч і Г. С. Кеброўскі прапанавалі дабавіць пункт: **«Закончыць перагляд праграм, прынцыпаў вывучэння і напісанне стабільных падручнікаў па прыродазнаўчых навуках для сярэдніх школ, у прыватнасці па фізіцы і матэматыцы».**

Супрацоўнікі кафедры ядзернай фізікі прафесар С. С. Шушкевіч і аспірант М. М. Абрамчук прапанавалі дапаўненне па раздзелу VIII у наступнай фармуліроўцы: **«Забяспечыць далейшае ўдасканаленне ў вышэйшай школе метадаў навучання, якія садзейнічаюць развіццю творчай актыўнасці студэнтаў, іх індывідуальных здольнасцей, павышаюць эфектыўнасць і якасць навучальнага працэсу пры дапамозе шырокага выкарыстання навейшых тэхнічных сродкаў і ЭВМ».**

Асістэнт кафедры агульнай фізікі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі С. С. Вятохін так дапоўніў раздзел XII праекта: **«Прадоўжыць развіццё сеткі навукова-вытворчых аб'яднанняў. Прадугледзець магчымасць уключэння ВНУ і акадэмічных НДІ ў сістэму навукова-вытворчых аб'яднанняў на роўных правах з галіновымі НДІ і КБ».**

Выказана шмат крытычных заўваг і пажаданняў па карэннаму паляпшэнню работы служб забеспячэння і інфармацыі ва універсітэце. Указана на адсутнасць строгай эканоміі расходавання электраэнергіі, беражлівых адносін і рацыянальнага выкарыстання абсталявання і матэрыялаў, працоўнага часу супрацоўнікаў.

На факультэце па закранутых пытаннях хутка адбудзецца вытворчая нарада.

Усе выступаючыя з задавальненнем адзначылі, што калектыў фізічнага факультэта, ідучы насустрач XXVI з'езду КПСС, гатовы выканаць усе задачы, якія ставяць партыя і ўрад перад вышэйшай школай.

**Н. ХАЎРАТОВІЧ,**
**сакратар партбюро фізфака.**

## УЗМАЦНІЦЬ АДКАЗНАСЦЬ

У ПАВЫШЭННІ адказнасці і зладжанасці работы ў любой галіне нашай дзейнасці першаступенную ролю адыгрывае ўзаемадзеянне паміж кіраўнікамі і выканаўцамі. Усебакова абгрунтаваная рэкамендацыя па паляпшэнню работы не будзе рэалізавана, калі яна сустрэне раўнадушнага выканаўцу. Мы можам назіраць гэта і ў час сельскагаспадарчых работ, і ў паўсядзённай практыцы вышэйшай навучальнай установы.

Без творчай работы выканаўцы кіраўнік не мае магчымасці праверыць, што ў яго патрабаваннях і рэкамендацыях адпавядае мэце паляпшэння работы, што неабходна выправіць, чаго наогул пазбегнуць. Без добрасумленнага і зацікаўленага выканаўцы не можа быць і сапраўднага кіраўніцтва. Узаемасувязь гэтых двух звенняў відавочная. Таму прапаную дапоўніць трэці абзац шостага параграфа ў IV раздзеле «Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года» наступным тэкстам:

**«Узмацніць адказнасць і заахвочваць ініцыятыву гаспадарчых кіраўнікоў, рабочых, калгаснікаў і служачых у дасягненні высокіх вынікаў і якасці работы...»**

**М. КОРЗУН,**
**старшыня прафбюро гістфака.**



**З творчым натхненнем пачалі заняткі студэнты факультэта журналістыкі ў другім семестры.**

## ВЫЗНАЧАНЫ ЛЕПШЫЯ

ПРАЙШОЎШЫ ва універсітэце агляд-конкурс на лепшую пастаноўку вынаходніцкай і патэнтна-ліцэнзійнай работы на кафедрах і ў навуковых падраздзяленнях прыродазнаўча-тэхнічнага профілю прысвячаецца XXVI з'езду КПСС. Ён праводзіўся з мэтай масавага прыцягнення навукова-педагагічных работнікаў, навукова- і вучэбна-дапаможнага персаналу, аспірантаў і студэнтаў да актыўнай вынаходніцкай творчасці і асваення патэнтнай справы, шырокага выкарыстання патэнтнай інфармацыі пры правядзенні навукова-даследчых работ, павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

У аглядзе прынялі ўдзел 26 універсітэцкіх падраздзяленняў. Некаторыя кафедры і лабараторыі не падавалі матэрыялы на конкурс, бо вынаходніцкая работа ў іх пастаўлена, на жаль, не на належны ўзровень.

Кампетэнтная камісія, у састаў якой увайшлі прадстаўнікі рэктарата, парткома, мясцовага камітэта прафсаюза і савета УТВР універсітэта, вызначыла пераможцамі лабараторыю экстракцыйных і сарбцыйных працэсаў НДІ ФХП (першае месца), 25-ы аддзел СКТБ з ВВ (другое месца), кафедру неарганічнай хіміі (трэцяе месца).

Пры падвядзенні вынікаў асноўныя паказчыкі, у лік якіх уваходзілі: колькасць дыпломаў на адкрыцці, колькасць дысертацый, пры выкананні якіх прадстаўлены заяўкі на вынаходніцтвы, колькасць членаў УТВР, колькасць атрыманых дыпломаў на адкрыцці, станоўчых рашэнняў на выдачу аўтарскіх пасведчанняў на прамысловыя ўзоры, колькасць аб'ектаў, прынятых да патэнтавання за мяжой, колькасць атрыманых патэнтаў, колькасць пададзеных ліцэнзій, колькасць экспанатаў выставак і г. д., суадносіліся з агульнай колькасцю навукова-педагагічных работнікаў, інжынераў і аспірантаў падраздзяленняў. Такая сістэма выяўлення пераможцаў мае свае недахопы: некаторыя кафедры, у якіх зарэгістравана шмат вынаходніцтваў, маюць вялікую колькасць супрацоўнікаў і таму пры падвядзенні вынікаў атрымліваюць невялікія паказчыкі.

Па прапанове загадчыка кафедры ядзернай фізікі прафесара С. С. Шушкевіча і загадчыка кафедры фізікі паўправаднікоў дацэнта В. Ф. Стэльмаха колькасць паказчыкаў трэба павялічыць, а пры падвядзенні вынікаў улічваць не толькі адносныя паказчыкі, але і агульны ўклад падраздзяленняў у дасягненні універсітэцкай навукі.

Савет УТВР абавязкова прыме да ўвагі выказаныя прапановы, тым больш, што мы плануем праводзіць ва універсітэце такія агляды-конкурсы штогод.

**В. ЯМНЫ,**
**старшыня савета УТВР БДУ.**

РЭХА КАНІКУЛАЎ

# МАРШРУТАМІ ЗОРНЫХ ПАХОДАЎ



ПАХМУРНАЕ надвор'е пагражала адлігай. Але гэта не магло спыніць юнакоў і дзяўчат з рукзакамі і лыжамі, што выстраіліся ля мемарыяльнай Дошкі ахвярам фашызму. На штармоўках— чырвоныя стужкі з надпісам «Зорны паход па БССР», «XXVI з'езду КПСС — дастойную сустрэчу!».

Упершыню з гэтага сімвалічнага месца стартавалі традыцыйныя зімовыя паходы турыстаў БДУ па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа.

Рапарт аб гатоўнасці да паходу прыняў член парткома І. В. Марчанка. Член КПСС з 1917 года, ветэран Вялікай Айчыннай вайны А. С. Сакалоў і палкоўнік у адстаўцы А. Н. Мяшкоў, удзельнік вызвалення горада-героя Мінска, пажадалі пошукавым групам поспехаў у іх высакароднай і адказнай справе.

Дзевяць турысцкіх груп прайшлі па гарадах і сёлах Мінскай, Брэсцкай, Віцебскай і Гомельскай абласцей, а маршрут, па якім вёў турыстаў чацвёртакурснік хімфака Ю. Грыгор'еў, праходзіў па дарогах Беларусі і Літвы. За час паходу студэнты пазнаёміліся з дасягненнямі выпускнікоў БДУ, якія працуюць у розных кутках нашай рэспубліцы, правялі значную работу па прафесійнай арыентацыі сярод старшакласнікаў, маладых рабочых і калгаснікаў, выступілі з лекцыямі і дакладамі па перадз'ездаўскай тэматыцы.

Але асноўнай мэтай зорных паходаў сталі пошукі звестак і матэрыялаў аб былых выпускніках, студэнтах і супрацоўніках нашага універсітэта, якія змагаліся за Радзіму. Сабраныя матэрыялы будуць выкарыстаны для стварэння універсітэцкай галерэі памяці, што адкрыецца напярэдадні 60-годдзя Белдзяржуніверсітэта.

**Т. САХАШЧЫК.**



**На здымках:** Аляксей Нічыпаравіч **Мяшкоў** жадае ўдзельнікам зорнага паходу «лёгкай лыжні»; наперадзе цікавыя сустрэчы, пошукі і знаходкі.

Фота **М. Дубовіка.**

## НАРАДА МАТЭМАТЫКАЎ

**У «Асноўных напрамках эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года» вызначаны важнейшыя задачы развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу, падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Гэта выклікае неабходнасць забеспячэння распрацоўкі і рэалізацыі мэтавай комплекснай праграмы па рашэнню важнейшых навукова-тэхнічных праблем, павышэння эфектыўнасці выкарыстання навуковага патэнцыялу ВНУ для вырашэння народнагаспадарчых задач, удасканалення падрыхтоўкі, кваліфікацыі і атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў. Менавіта аб гэтым ішла размова на нядаўна адбыўшайся ва універсітэце нарадзе па пытаннях сувязі навукі з вытворчасцю і падрыхтоўкі кадраў спецыялістаў, у якой прынялі ўдзел прафесарска-выкладчыцкі састаў матэматычных факультэтаў БДУ, прадстаўнікі арганізацый, прымаючых выпускнікоў, акадэмікі, члены-карэспандэнты АН БССР, Героі Сацыялістычнай Працы, лаўрэаты Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій і г. д.**

**На пленарным пасяджэнні з дакладамі аб шляхах павышэння эфектыўнасці і якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, ролі выкладчыка ў навучальным працэсе, навукова-даследчай рабоце, паляпшэнні выхавання будучых спецыялістаў, аб магчымасцях узаемнага ўзбагачэння творчых сувязей паміж вытворчасцю і ВНУ, праблемах найбольш поўнага выкарыстання вылічальнай тэхнікі, спецыялізацыі студэнтаў, накіроўваемых на заводы, якія вырабляюць ЭВМ, выступілі прарэктар БДУ імя У. І. Леніна прафесар А. С. Фядэнка, начальнік аддзела НДІ ЭВМ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі і прэміі Ленінскага камсамола Э. В. Кавалевіч, намеснік дырэктара НДІ ТК, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Я. І. Вялеська, галоўны матэматык ВТА вылічальнай тэхнікі А. І. Гаро і іншыя.**

**Шырокую цікавасць выклікала размова аб праблемах школьнай матэматычнай адукацыі, некаторых аспектах падрыхтоўкі праграмістаў, спецыялістаў для АСК, прыёме студэнтаў ва універсітэт, якая вялася на пасяджэннях педагагічнай і вытворчай секцый.**

**У час работы нарады працавала кніжная выстаўка, падрыхтаваная бібліятэкай БДУ, на якой былі прадстаўлены працы вучоных і выпускнікоў матэматычных факультэтаў БДУ, манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі з грыфам Мінвуза СССР і БССР.**

**С. ІВАНОВА.**

ТОЛЬКІ ФАКТ

## Вынаходнікі - пераможцы

САВЕТ УТВР універсітэта сумесна з рэктаратам і грамадскімі арганізацыямі ў мэтах далейшага павышэння эфектыўнасці навукова-тэхнічнай творчасці супрацоўнікаў і паскарэння ўкаранення іх вынаходніцтваў у народную гаспадарку правёў конкурс на лепшага вынаходніка Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. У конкурсе прынялі ўдзел 18 лепшых вынаходнікаў.

Першае месца з сумай 652 балы заняў дацэнт кафедры ядзернай фізікі В. Я. Ямны, на другім месцы — загадчык кафедры фізікі паўправаднікоў дацэнт В. Ф. Стэльмах (273 балы). Нямногім менш, 244 балы, набраў асістэнт кафедры агульнай фізікі С. С. Вятохін.

Лепшым маладым вынаходнікам універсітэта прызнаны В. Н. Лінёў, асістэнт кафедры ядзернай фізікі.

**Э. ДРАБ,**
**загадчык аддзела вынаходніцкай і патэнтнай работы.**

## Трэцяе месца

У АЛМА-АЦЕ праходзіў традыцыйны ўсесаюзны матч універсітэцкіх каманд па мастацкай гімнастыцы, у якім удзельнічала і зборная БДУ ў саставе Алены Курніловіч (3-ці курс, хімфак), Наталлі Журко (3-ці курс, геафак), Ліліі Барадзіной, Ірыны Глушак, Ірыны Сакрэт (усе — 1-ы курс, гістфак), Таццяны Гарноўскай (спортклуб), Ірыны Білейчык (1-ы курс, журфак).

Асаблівую ўвагу гледачоў і суддзяў звярнула на сябе студэнтка з Арджанікідзе Ала Кошалева, майстар спорту міжнароднага класа, член зборнай каманды СССР. Яна заняла першае месца ў асабістым першынстве. На другім і трэцім месцах—студэнткі Казахскага універсітэта Дзіна Мусіна і Таццяна Палявая.

У камандным заліку перамаглі гаспадыні першынства, другое месца занялі дзяўчаты з Арджанікідзе, трэцяе — зборная нашага універсітэта.

З самага пачатку спаборніцтваў удзельніцы адчувалі клопат і ўвагу студэнтаў і выкладчыкаў КДУ.

**І. БІЛЕЙЧЫК,**
**удзельніца спаборніцтваў.**

ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ

# Час вынікаў, час спадзяванняў

НАВУКОВА - ТЭХНІЧНУЮ РЭВАЛЮЦЫЮ нельга ўявіць у сучасны момант без вылічальнай тэхнікі. Паслугамі яе пачалі карыстацца вучоныя і спецыялісты самых розных галін і напрамкаў, часам далёкіх да дакладных, — мовазнаўства, напрыклад. Меў рацыю паэт, калі пісаў, што «нынче физики в почете». Сапраўды, электронна-вылічальныя машыны і іншыя праграмныя кіруючыя сістэмы здольны замяніць не адну сотню высокаадукаваных спецыялістаў. Не цяжка цяпер зразумець, што значыць для чалавецтва развіццё і ўдасканаленне вылічальнай тэхнікі, чым абарочваецца разумнае, мэтанакіраванае выкарыстанне «электроннага мозгу».

Кафедра агульнага праграміравання самая маладая на факультэце прыкладной матэматыкі — яна была створана ў 1973 годзе. Але, нягледзячы на яўна «дзіцячы» ўзрост, мае ўжо свае традыцыі і поспехі. Яна — заканадаўца новага напрамку ў праграміраванні. Супрацоўнікі кафедры першымі ў краіне робяць спробы (і, трэба адзначыць, паспяховыя) перайсці на новую сістэму складання праграм для ЭВМ, на сістэму з падзелам часу і структурнае праграміраванне.

У чым сэнс гэтай навінкі? І чаму менавіта цяпер пераходзяць на новыя сістэмы?

Расказвае загадчык кафедры Генадзь Антонавіч Драбушэвіч:

— Магчымасці электронна-вылічальнай тэхнікі практычна неабмежаваныя. Яе «электронны мозг» і фантастычная памяць неабходны прамысловасці, навуцы, тэхніцы. І вось у той час, калі ЭВМ можа выконваць мільён і больш аперацый у секунду, складанне праграм для яе вядзецца, можна сказаць, саматужным спосабам, марудна і непрадукцыйна. Часам на гэта патрабуецца не адзін месяц. Складаных момантаў тут шмат, і адзін з іх у тым, што праграмістамі ў асноўным працуюць жанчыны. А яны, як вядома, найбольш часта адрываюцца ад работы па чыста аб'ектыўных прычынах. Прыходзіцца пачынаць работу занава, бо перадаваць праграму іншаму спецыялісту эканамічна нявыгадна.

Гэтых недахопаў дазваляе пазбегнуць аперацыйная сістэма АС ЭВМ, сістэма з падзелам часу і структурнае праграміраванне. Кожная з гэтых сістэм, нягледзячы на пэўныя адрозненні, мае агульную рысу і дазваляе ствараць тэхналогію праграмы. Спецыялісты кафедры падлічылі, што з выкарыстаннем новага метаду прадукцыйнасць працы ўзрастае ў два разы. Адпаведна ўзрастае якасць выканання работ.

Паставіць працэс складання праграм для ЭВМ на сучасны ўзровень і выкарыстоўваць машынны час найбольш прадукцыйна, працягвае Г. А. Драбушэвіч,— галоўная задача дня. На гэта накіраваны ўсе намаганні супрацоўнікаў кафедры.

Усё, аб чым гаварылася вышэй, — далёка не поўны пералік задач, што стаяць перад кафедрай агульнага праграміравання. Галоўная з іх —падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі краіны. Будучы інжынер фарміруецца перш за ўсё ва універсітэцкіх аўдыторыях і лабараторыях. Значная работа вядзецца па падрыхтоўцы вучэбнай і метадычнай літаратуры па дысцыплінах «ЭВМ і праграміраванне», «Практыкум на ЭВМ» і вучэбнай практыцы. Генадзь Антонавіч зачытаў спіс вучэбна-метадычнай літаратуры для студэнтаў першых-другіх курсаў, выдадзенай у 1979 годзе. Тут адзінаццаць найменняў. Вялікая ўвага аддаецца падрыхтоўцы наглядных дапаможнікаў. Толькі за мінулы год іх падрыхтавана больш сотні адзінак.

Навукова - даследчая работа. У гэтым кірунку кафедра мае пэўныя здабыткі. Тут працуе студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя, членамі якой з'яўляюцца звыш 70 студэнтаў. Многія работы, падрыхтаваныя імі, аднесены да першай катэгорыі на рэспубліканскім аглядзе. А работы студэнтаў кафедры Г. Даўжэнкавай, Г. Ермакова і А. Зантовіча адзначаны дыпломамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ як лепшыя ў галіне матэматыкі ў краіне.

Кафедра выконвае гаспадарчадагаворныя работы для многіх прадпрыемстваў Беларусі і іншых рэспублік. Сярод іх —Мінскі завод халадзільнікаў і тонкасуконны камбінат, Гродзенская абутковая фабрыка «Нёман»... Такая садружнасць навукі з вытворчасцю дае станоўчыя вынікі. Так, эканамічны эфект ад укаранення задач АСК у мінулым годзе склаў больш як 480 тысяч рублёў, а за ўсю пяцігодку — 1,5 мільёна рублёў.

На базе кафедры створана і паспяхова працуе школа «Юны праграміст». Менавіта яна вызначыла выбар будучай прафесіі для многіх учарашніх школьнікаў. Дастаткова сказаць, што толькі ў гэтым навучальным годзе яе актыўнымі членамі з'яўляюцца 150 юнакоў і дзяўчат мінскіх школ і больш чым 500 школьнікаў з іншых гарадоў і вёсак рэспублікі, якія аб'яднаны ў 18 куставых цэнтраў. Школа падтрымлівае з імі сувязь праз газету «Знамя юности». Тры разы ў год выкладчыкі выязджаюць з лекцыямі.

Гаворачы пра поспехі кафедры ў арганізацыі вучэбнага працэсу і ў навуковай дзейнасці, нельга не адзначыць тыя цяжкасці, што сустракаюцца ў рабоце. Гэта, у першую чаргу, матэрыяльна-тэхнічная база, складаныя ўмовы з памяшканнямі (СНДЛ да цяперашняга часу не мае ўласнай аўдыторыі) і інш. Безумоўна, усё гэта адбіваецца на агульных паказчыках.

Значных поспехаў дасягнулі супрацоўнікі кафедры агульнага праграміравання ў мінулым годзе і за пяцігодку ў цэлым. Наперадзе — новыя планы. Спадзяёмся, што яны будуць паспяхова выкананы.

**А. ЛАЗОЎСКІ.**

# ПАЛАЖЭННЕ

**АБ ПРАВЯДЗЕННІ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, ПРЫСВЕЧАНАГА XXVI З'ЕЗДУ КПСС І 60-ГОДДЗЮ УНІВЕРСІТЭТА.**

Агляд мастацкай самадзейнасці праводзіцца ў актавай зале БДУ імя У. І. Леніна з 30 сакавіка па 4 красавіка 1981 года. Парадак удзелу факультэтаў у аглядзе-конкурсе вырашае жараб'ёўка. Агляд-конкурс ВІА праводзіцца 28 сакавіка. Вакальна-інструментальныя ансамблі прадстаўляюць праграму на 15—20 мінут. У залік канцэртнай праграмы агляду ідуць балы, атрыманыя за два лепшыя нумары.

У аглядзе прымаюць удзел студэнты дзённай і вячэрняй формы навучання. Дапускаецца ўдзел прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў у якасці салістаў.

Час конкурснай праграмы не больш 1,5 гадзіны.

Факультэту прадастаўляецца магчымасць правесці дзве рэпетыцыі ў актавай зале галоўнага корпуса з працягам не больш 2 гадзін. Праграму канцэрта ў 15 экземплярах неабходна прадставіць у праўленне клуба да 20 сакавіка 1981 года. Пры падвядзенні вынікаў агляду ўлічваецца шырыня ахопу розных жанраў і форм самадзейнай творчасці, прадстаўленых у канцэртнай праграме:

— інструментальныя ансамблі не больш трох твораў (з улікам выканання з салістамі);

— салісты-выканаўцы ўсіх жанраў не больш двух твораў;

— харэаграфічныя групы выконваюць не больш трох твораў (без уліку сольных танцаў);

— харавыя калектывы не больш трох твораў, з якіх два абавязковыя.

Судзейства конкурсу здзяйсняе журы. У састаў журы ўваходзяць прадстаўнікі грамадскіх і творчых арганізацый, кіраўнікі народных калектываў універсітэта.

Нумары мастацкай самадзейнасці ацэньваюцца па 10-бальнай сістэме. У залік ідуць ацэнкі за лепшыя 15 нумароў (з улікам выступлення ВІА). Шаснаццатую адзнаку складаюць балы за рашэнне канцэртнай праграмы.

Ацэньваючы канцэртную праграму, журы конкурсу ўлічвае: ідэйны і мастацкі ўзровень праграмы, прадстаўленасць жанраў і відаў самадзейнага мастацтва; выкананне конкурсных умоў, сцэнічную культуру, масавасць, складанасць рэпертуару, рэжысуру канцэрта.

Калектыў мастацкай самадзейнасці факультэта, які заняў першае месца, узнагароджваецца пераходным кубкам прафкома універсітэта, Ганаровай граматай і грашовай прэміяй рэктарата ў размеры 200 рублёў. Калектывы, занялўшыя другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца ганаровымі граматамі і грашовай прэміяй рэктарата ў размеры адпаведна 150 і 100 рублёў

Лепшыя калектывы і выканаўцы прымаюць удзел у заключным канцэрце, на якім будуць аб'яўлены вынікі агляду.

## ✵ ЗІМЫ ✵ ЧАРОЎНЫЯ МАЛЮНКІ





*Зіма развесіла карункі*
*На голлях елак і бяроз—*
*Свае чароўныя малюнкі*
*Ствараў для нас*
*Мастак-мароз...*

● **З НАШАЙ ПОШТЫ**

## «ЗНАЁМЯЦЬ З КРАІНАЙ»

ВОСЬ ужо трэці год мы, замежныя студэнты з многіх краін свету, вучымся на факультэце журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна. Шмат чаго мы даведаліся ад сваіх выкладчыкаў, савецкіх сяброў, нядрэнна авалодалі рускай мовай. Адным з любімых прадметаў для нас стала гісторыя КПСС, якую вёў Д. П. Жмуроўскі. Ён прыводзіў нам шмат цікавых фактаў, расказваў аб сваім жыцці. У тым, што мы добра займаемся, адчуваем сябе, як на радзіме, ёсць вялікая заслуга нашых савецкіх равеснікаў, аднакурснікаў, з якімі мы разам жывём у інтэрнаце, наведваем лекцыі. Яны з задавальненнем прыходзяць нам на дапамогу, тлумачаць незразумелае, знаёмяць са сваёй краінай.

**Мамо МУЛУГЕТА,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

САКРАТАРЫЯТ праўлення саюза журналістаў БССР, калегія Міністэрства ўнутраных спраў рэспублікі, прэзідыум Рэспубліканскага савета таварыства аўтамотааматараў пастанавілі правесці конкурс на лепшае асвятленне пытанняў бяспекі руху газетамі рэспублікі.

Конкурс, у якім прыме ўдзел і наша газета, праходзіць з 1 студзеня па 15 лістапада 1981 года. Яго мэта — далейшая актывізацыя работы рэдакцыйных калектываў газет па прапагандзе пытанняў бяспекі руху, прыцягненне ўвагі шырокай грамадскасці да праблем аўтамабілізацыі, а таксама для аб'яднання і каардынацыі намаганняў журналістаў, работнікаў Дзяржаўтаінспекцыі, прадстаўнікоў грамадскасці ў справе ўмацавання дарожнай дысцыпліны сярод удзельнікаў руху.

Побач са штатнымі работнікамі рэдакцыі да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца работнікі ДАІ, прадстаўнікі грамадскасці, а таксама ўсе чытачы нашай газеты.

Матэрыялы конкурсу будуць друкавацца пад эмблемай «Прэсаўтаклуб».

Для шматтыражных газет, якія перамаглі ў конкурсе, устанаўліваюцца наступныя прэміі: першая — 150 рублёў, другая — 125 рублёў, трэцяя— 100 рублёў і тры заахвочвальныя прэміі па 50 рублёў. Прычым 50 працэнтаў гэтых грошай будзе выкарыстана на заахвочванне штатных супрацоўнікаў рэдакцыі і столькі ж — для ўзнагароды няштатных аўтараў, якія найбольш актыўна выступалі з публікацыямі на гэтую тэму.

# ІСТОТНЫЯ ПОСПЕХІ

**Кафедру дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва на юрыдычным факультэце БДУ імя У. І. Леніна 15 год узначальвае прафесар Анатоль Аляксандравіч ГАЛАЎКО. З ім вядзе размову наш карэспандэнт І. МІЦЯЕВА.**

**— Анатоль Аляксандравіч, ваша кафедра — адна з самых буйнейшых на факультэце, ды і кола пытанняў, якімі вы займаецеся, мае шырокі дыяпазон...**

— На кафедры працуюць 11 чалавек, вывучаецца і выкладаецца шмат прадметаў, а іменна: савецкае дзяржаўнае права, савецкае фінансавае права, дзяржаўнае права буржуазных краін, дзяржаўнае права замежных сацыялістычных краін, зямельнае права і прававая ахова прыроды.

**— Аднак гэтым дзейнасць калектыву не абмяжоўваецца. Вы праводзіце значную навуковую работу, у якой удзельнічаюць і студэнты.**

— Поспехамі ў гэтым напрамку мы ганарымся. На ўсесаюзны агляд навуковых работ у Свярдлоўск наш студэнт Т. Варановіч прадставіў даследаванне «Суверэнітэт БССР у саставе савецкай федэрацыі», за якое атрымаў Ганаровую грамату і віншаванне аргкамітэта. Высокія ацэнкі на рэспубліканскім аглядзе-конкурсе атрымалі яшчэ 14 работ студэнтаў-юрыстаў.

**— Анатоль Аляксандравіч, я бачу перад сабой маляўніча аформлены стэнд «Міжнародныя сувязі кафедры»...**

— Гэта адзін з важных і адказных напрамкаў нашай работы. Стэнд адлюстроўвае сувязі нашага факультэта і кафедры з вучонымі-юрыстамі ГДР. Мы падтрымліваем сяброўскія сувязі з польскімі, балгарскімі, югаслаўскімі, венгерскімі, чэхаславацкімі вучонымі.

**— У чым канкрэтна заключаюцца гэтыя сувязі!**

— Перш за ўсё мы супрацоўнічаем па лініі навукі, акрамя таго, распрацоўваем методыку вучэбнага працэсу. Сумесна з вучонымі ГДР апублікавалі серыю артыкулаў у трох навуковых часопісах Іенскага універсітэта, з юрыстамі з Бабельсберга выпусцілі зборнік навуковых прац у двух тамах, прысвечаны 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. У гэтым зборніку змешчаны артыкулы амаль усіх членаў нашай кафедры. Нямецкія юрысты ўважліва ставяцца да меркаванняў нашых вучоных, цэняць і паважаюць іх навуковыя працы. Нядаўна, напрыклад, манаграфія дацэнта У. П. Сярэбранікава «Канстытуцыйнае права Францыі» была паўторна выдадзена ў Бабельсбергу на нямецкай мове.

Члены нашай кафедры апублікавалі шмат работ у навуковых часопісах Францыі, Галандыі, Балгарыі, Чэхаславакіі, ГДР.

**— Але без непасрэдных сустрэч з замежнымі вучонымі работа кафедры ў гэтым напрамку была б менш прадукцыйнай і для вас, і для вашых замежных сяброў.**

— Мы даволі часта сустракаемся з імі на розных міжнародных канферэнцыях, часам па лініі ААН. Так, на канферэнцыі ААН у Жэневе па праблеме тэрытарыяльнага прыстанішча прысутнічала дэлегацыя БССР, якую я ўзначальваў. А дацэнт нашай кафедры У. П. Сярэбранікаў удзельнічаў у міжнароднай канферэнцыі па марскому праву.

Нашы замежныя сувязі ўмацоўваюцца і тым, што на кафедры навучаюцца замежныя аспіранты Самір Шахін з Судана і Хуан Сіманкас з Кубы.

**— Калектыў кафедры паспяхова выканаў сацыялістычныя абавязацельствы ў дзесятай пяцігодцы. Якія планы на 1981 год!**

— Перш за ўсё ўвагу мы звернем на падрыхтоўку да выдання ў 1981 годзе манаграфіі «Удасканаленне дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнай улады сацыялістычных краін» сумесна з вучонымі ГДР. Дасягнута таксама дагаворанасць з вучонымі Люблянскага універсітэта аб сумесным выданні манаграфіі аб мясцовых органах улады ў СССР і Югаславіі.

# ЯК ВАША ЗДАРОЎЕ?

**РАЯЦЬ УРАЧЫ**

КУРЭННЕ тытуню — найбольш распаўсюджаны від наркаманіі. Выклікае трывогу рост колькасці тых, хто курыць. Курэнне прыносіць вялікую шкоду здароўю. Пры курэнні разам з паветрам пападае ядавіты тытунёвы дым, у якім знаходзіцца нікацін, сінільная кіслата, пірыдзін, вокіс вугляроду, мыш'як, серавадарод, аміяк і іншыя хімічныя рэчывы, шкодныя для арганізма. Найбольш шкодны — нікацін. Ён добра засвойваецца слізістымі абалонкамі рота, носа, страўніка, лёгкіх і хутка паступае ў кроў, распаўсюджваецца па ўсяму арганізму.

Пры выкурванні адной цыгарэты ў арганізм паступае 4—5 міліграмаў нікаціну, у той час як 80 міліграмаў яго — ужо небяспечная для жыцця доза. У людзей, якія кураць даўно, па прычыне паступлення нікаціну ў арганізм малымі дозамі наступае хранічнае атручванне нікацінам, што таксама адмоўна ўплывае на нервовую сістэму і ўнутраныя органы. У табачным дыме ёсць канцэрагенныя вуглевадароды, якія адкладваюцца ў лёгкіх курыльшчыка і могуць абумовіць у іх развіццё рака. Шкода ад тытуню знаходзіцца ў прамой залежнасці ад колькасці выкурваемых цыгарэт.

У выніку курэння могуць развівацца хранічны ларынгатрахеід, бранхіт, эмфізэма лёгкіх. Аднак калі кінуць курыць у раннім узросце, то функцыя органаў дыхання вяртаецца да нормы.

Курэнне павялічвае частату ўзнікнення і цяжкага працэсу ішэмічнай хваробы сэрца, з'яўляецца асноўным фактарам рыску інфаркту міякарда.

Курыльшчыкі шкодзяць не толькі свайму здароўю, яны ствараюць дрэнныя ўмовы для тых, хто навокал, асабліва наносяць шкоду здароўю дзяцей. Праведзеныя даследаванні паказалі, што дзеці бацькоў, якія кураць, у большай ступені, чым дзеці тых, што не кураць, могуць атрымаць захворванне органаў дыхання.

Кінуць курыць можа кожны, незалежна ад стажу курэння. Трэба толькі мець дакладнае ўяўленне аб шкодным дзеянні курэння на арганізм. Кідаць курыць належыць адразу. Для гэтага трэба выбраць зручны момант, напрыклад, у час адпачынку, камандзіроўкі, у канцы працоўнага тыдня. Літаральна ўсе, хто кідае курыць, адзначаюць паляпшэнне настрою, памяншэнне раздражняльнасці, павышэнне працаздольнасці.

**М. ЦЫРУЛЬНІКАВА,**
**загадчыца паліклінікі БДУ імя У. І. Леніна.**

## АБ'ЯВЫ

### ДНІ ДОНАРА

**Штогод у нашай краіне праводзіцца каля 15 мільёнаў аперацый. Многія з іх нельга выканаць без пералівання крыві.**

**Паліклініка БДУ праводзіць 17 і 18 лютага 1981 года дні донара. Запрашаем усіх студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта на донарскі пункт.**

### ВЫСТАЎКА ЛІТАРАТУРЫ

**Бібліятэка БДУ сумесна з кафедрай гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў арганізуе з 18 па 20 лютага 1981 года выстаўку літаратуры па гісторыі КПСС.**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**

**12 лютага 1981 г.**

Заказ 274. АТ 02089

**220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.**

**ТЭЛЕФОН 20-68-27.**

**Рэдактар**

**В. П. ВАРАБ'ЁЎ**